УДК 821.161.3

**_В.М. Смаль_**
*канд. філал. навук, дац., дац. каф. дашкольнай адукацыі*
*Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна*

# ЭВАЛЮЦЫЯ ТВОРЧАЙ ІНДЫВІДУАЛЬНАСЦІ М. ФЕДЗЮКОВІЧА Ў КАНТЭКСЦЕ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ МАСТАЦКІХ ТРАДЫЦЫЙ

*У артыкуле ўвага звяртаецца на сінкрэтызм творчых уплываў і наследавння на розных этапах творчасці пісьменніка, паступовае выцясненне экзістэнцыйна-трагедыйнай парадыгмы сентыментальна-рамантычным элементам (падаўленне грамадзянскіх матываў і пашырэнне лірызму, аўтабіяграфізму, рэгіянальнага пачатку).*

Літаратурная спадчына Міколы Федзюковіча – яркая і самабытная з’ява ў галіне перакладу, публіцыстыкі, крытыкі, паэзіі. Актыўны эстэтычны праксіс пісьменніка, сінкрэтычны характар яго творчасці, глыбіня творчага перастварэння вопыту папярэднікаў (рэгіянальных паэтаў і паэтаў-класікаў) вызначаюць як творчую індывідуальнасць мастака, так і якасны ўзровень яго творчасці ў цэлым.

Раскаванасць паэтычнай думкі, адвольнасць трактоўкі традыцыйных матываў характэрны ўжо для дэбютнай кнігі М. Федзюковіча «Зямля-магніт» (1968), якая акрэсліла перыяд станаўлення творчай манеры, пошук «сваёй» тэмы, выпрацоўкі дамінант, што будуць вызначаць пазнейшыя творы. Скіраванасць думак і пачуццяў лірычнага «я» на з’явы асабістага і грамадскага жыцця, якія сталі гісторыяй, абумовілі метафарычны сэнс назвы зборніка: зямля нібы магнітам прыцягнула і трымае памяць чалавецтва. Падобны «рэтраспектыўны» тып пісьма заўважны ўжо ў першым вершы «Балада пра буслоў», дзе асноўны фабульны матэрыял будуецца на ўспамінах лірычнага героя, і ў цэнтры стаіць пераважна лірычнае «я-мінулае», а не «я-цяперашняе»: «Колькі помню я выраяў, // вырай той – самы жудасны вырай... // Мы жылі у зямлянках, // мы ў бога не верылі, // мы насілі кашулі навырост» [1, с. 4].

Адметнасць лірычнага героя М. Федзюковіча ярка і выразна выяўляецца ў скіраванасці на метафізічнае ўспрыманне акаляючага свету. Мінулае ва ўяўленні паэта – паняцце ўніверсальнага значэння, якое з’яўляецца паказчыкам гарманічнага існавання чалавека, цэласнасці яго светабачання і светаразумення. Мінулае арыентуе лірычнага героя М. Федзюковіча на спецыфічнае трансцэндэнтнае выяўленне элегічна-драматычнага і адначасова пазітыўнага, мажорна-аптымістычнага, аднак менавіта такое светаасэнсаванне ўяўляецца надзвычай важным фактарам паўнавартаснага духоўнага жыцця асобы. Дзяцінства, абпаленае і знявечанае полымем вайны, усё астатняе жыццё неадступна ішло за паэтам, вярталася ў памяць, стала дамінантным ядром паэтычнага ўніверсуму М. Федзюковіча. Убачанае і перажытае ў цяжкія пасляваенныя гады як споведзь цэлага пакалення дзяцей вайны знайшло сваё мастацкае ўвасабленне ў творах пісьменніка, стала ўнутраным балючым водгукам яго лірычнага героя: «Хату будаваць збіраўся тата, // каб не знацца болей з буданамі. // А вайна для бацькі майго хату // без дзвярэй, без вокан збудавала. // Мы тады намёрзліся удосталь – // навісала неба коўдрай белай. // Я ішоў з маленства у дарослaсць // па снягах між соснаў карабельных» [1, с. 11].

У кнізе «Зямля-магніт» шмат вершаў пра каханне, якія прэзентавалі дасканалы ўзровень пісьма М. Федзюковіча: гранічную вытанчанасць паэтычнай тэхнікі, псіхалагічную культуру пачуцця, сучасную раскаванасць паэтычнага слоўніка. Шэраг гэтых твораў («Цыганка варажыла, варажыла...», «Неба зоркамі вышыта густа», «Заручыны») засведчылі дасканалае ўменне паэта стылізаваць матэрыял верша пад фальклор на ўзроўні рытма, меладыкі народнай песні, псіхалагічных паўтораў, народна-паэтычных вобра-

заў з адначасовым захаваннем арыгінальнага аўтарскага зместа, што ў цэлым было характэрна для літаратурнай генерацыі шасцідзесятнікаў-сямідзесятнікаў (Е. Лось, В. Вярба, Я. Янішчыц, Д. Бічэль-Загнетава, Н. Мацяш, Р. Баравікова, М. Мятліцкі, У. Мазго, Я. Мальчэўская і інш).

У інтымнай лірыцы праявілася тонкая паэтычная манера вершатворчасці М. Федзюковіча, калі асноўны акцэнт у радку канцэнтраваўся на фабульна разгорнутым асацыятыўным вобразе, калі пісьменнік звяртаўся да надзвычай далікатнай, тонкай, дотыкавай метафары. Лірычны герой гэтых твораў адчувае гатоўнасць душэўна-фізічнага зліцця з прыродай, каб быць увесь час з любым чалавекам: «Я зраблюся лугавінай роснай, // каб прайсці ты міма не змагла. // Рассцялюся роўнай сцежыною – // буду слухаць дотык ног тваіх» [1, с. 54]. У вершах М. Федзюковіча каханне паказваецца вытанчаным, трапяткім, далікатным пачуццём, якое патрабуе гарманічнай адпаведнасці і ў паводзінах асобы. Гэта ўласціва лірычнаму герою паэта Драгічынскага краю, які здольны не толькі выявіць уласную пяшчоту, але і суперажываць дарагой сэрцу асобе: «Ты хуценька нагнулася – // пяшчотна // трымала ты // на пальцах птушаня. // Нямоглая і кволая істота, // ахвяра першай летняй навальніцы, // ляжала на абветранай далоні» [1, с. 8].

Па сіле пачуцця, далікатнасці, цнатлівасці, пяшчотнасці вершы пра каханне М. Федзюковіча нагадваюць лепшыя ўзоры інтымнай лірыкі так званай жаночай паэзіі (Е. Лось, Р. Баравіковай, Н. Мацяш, Я. Янішчыц і інш.), дзе, аднак, адсутнічае драматызм, палкасць, меладраматычныя спады, матыў святасці пачуцця, калі паэтэсы свайго абранніка называлі «адзіны мой», «мой сусвет», «мой бог» і г.д. Прыёмы драматызацыі і экзальтацыі пачуцця не ўласцівы паэту М. Федзюковічу нават у канстатацыі сітуацыі растання. У вершах мастака адсутнічаюць згушчанасць трагізму, безвыходнасці ў апяванні падобных перажыванняў. Эмацыйна-псіхалагічную дамінанту інтымнага свету лірычнага суб’екта М. Федзюковіча вызначае найперш спавядальнасць, шчымлівасць пачуцця: «Па маўклівых слядах, // што застылі ў снягах, // я ішоў у твой сад малады... // А цябе не спаткаў, // бо разлука – // сцяна, даўжынёю ў чатыры гады» [1, с. 36].

Лірычны герой М. Федзюковіча даволі стрыманы ў выяўленні гранічнай роспачы, што з’яўляецца характэрнай рысай «мужчынскіх» вершаў пра каханне. У той жа час падкрэсленая палкасць, імпульсіўнасць выяўляецца пры апісанні паэтам моманту нараджэння пачуцця кахання, калі «сэрца, у якім любові цесна, вось-вось гатова выбухнуць»: «Глядзеў, глядзеў я – і кожным нервам, // і кожнай жылкай адчуў, як лёгка // ў маю істоту ўвайшла Венера // сваёй цнатлівасцю басаногай» [1, с. 38]. Аўтар верша «Святлела неба ўсё вышай, вышай...» падсвядома паўтарыў фабульны матэрыял Броўкавага шэдэўра «Пахне чабор»: «глядзеў», «хацеў усклікнуць», «апрытомнеў», «мінула многа спякотных маяў», «чакаю: а мо на бераг дзяўчына выйдзе». Падобнае наследаванне эстэтычнага вопыта класікаў, з аднаго боку, паскарала працэс мастацкага сталення, удасканалення майстэрства вершатворчасці, а з іншага боку, пазбаўляла паэтычны радок вобразна-пачуццёвай раскаванасці, «свежасці» гучання, стрымлівала з’яўленне арыгінальных жанрава-тэматычных мадыфікацый.

Важнае месца ў паэтычным універсуме М. Федзюковіча займаюць пейзажныя вершы. М. Федзюковіч – паэт не толькі роднага кутка. Яго цікавіць багацце, адухоўленая спагаднасць свету прыроды. М. Федзюковіч-пейзажыст не цураецца як абагулена-абстрактнага погляду на прыроднае наваколле, так і ўважліва-пранікнёнага стаўлення да навакольнай канкрэтыкі, знаходзіць ёмістыя вобразы-дэталі. Цэнтральнымі ў яго лірыцы з’яўляюцца знаёмыя і блізкія вобразы неба, ракі, леса, дрэва, луга, поля. Пейзажныя замалёўкі М. Федзюковіча натуральныя, маштабныя, жывапісныя. Гэта не проста апісанне, а найперш захапленне прыродным улоннем, паэтызацыя незвычайнасці, багацця, вабнасці канкрэтных мясцін і роднага краю ў цэлым: «Неба зоркамі вышыта густа. // Неба мне нагадвае хустку, // хустку ў крапінку, // хустку матчыну» [1, с. 33].

Глыбінныя і адухоўленыя словы-пачуцці, выкліканыя першароднасцю, сцішанасцю, нягучнасцю фарбаў прыроды ў М. Федзюковіча, спалучаюцца з нотамі трывогі, імкненнем засяродзіцца на важных, глыбінна значных для сябе праблемах. У вершах «Ведаеш, падчас бывае трудна», «Неба зоркамі вышыта», «Поўдзень», «Прачыналася рэчка Ясельда», «Трыялет» пейзаж – своеасаблівы эмацыйны фон, падсветка пачуццяў лірычнага героя, які сугучна прыроднаму наваколлю можа быць радасным, памяркоўным, лагодным, удумлівым, стрыманым, заклапочаным і г.д. Прырода як бы перадае свае эмоцыі лірычнаму «я», жыве падобнымі пачуццямі і перажываннямі: «Было ніякавата і нязвыкла // стаяць пад безмяцежна-ціхім дубам... // І штосьці таямніча-трапяткое // ў дрымотнай кроне дуба начавала. // Хісталася агромністая хмара, // агромленая сотнямі маанак... // А вербы і зялёныя бярозы // схілялі ветла вецце перад ветрам» [1, с. 7].

Лірычнаму герою М. Федзюковіча характэрна непасрэднасць светаўспрымання: вобразы прыроды ім бачацца пранікнёна-адухоўленымі. Ён горнецца да малюнкаў прыроды, шукае ў наваколлі душэўнага супакаення, своеасаблівых лекаў: «У нашым лесе дрэў нямала, // а мне радней усіх бяроза... // Бяроза крык мой сунімала, // бяроза стрымлівала слёзы» [1, с. 17]. Ва ўяўленні лірычнага героя М. Федзюковіча прадметна-рэчыўны свет, прырода валодае ўласцівасцямі зменлівасці, цякучасці, плыннасці, успрымаецца ім як ланцуг шматлікіх пераўвасабленняў. У стане самарэфлексіі лірычная асоба тонка ўспрымае, як незваротна сплывае час, непаўторныя імгненні жыцця. Своеасаблівым звяном дыялектычнага руху прыроднага сусвету адчувае лірычны герой М. Федзюковіча і ўласны метафізічны стан зажуранасці, болю: «Прачыналася рэчка Ясельда // і цякла ў старажытны бор... // Павандрую – // і зноўку я сюды // прынясу маёй страты боль» [1, с. 9]. У пейзажных вершах праявіўся ў М. Федзюковіча талент праніклівага лірыка, здольнага намаляваць словам жывапісныя малюнкі прыроднага ўніверсуму. Лірычны герой у гэтых творах паўстае асобаю, адоранай багатай душой, здольнай тонка ўспрымаць прыгажосць прыроды, суадносіць уласны настрой з фарбамі наўколля. Захапленне акаляючай рэчаіснасцю сведчыць і пра глыбокае пачуццё патрыятызму, якім валодае паэтычная асоба М. Федзюковіча.

Праграмны твор дэбютнага зборніка – верш «Ад каляровых сноў», лірычны герой якога высокім маральным ідэалам лічыць жыццё ў родным краі, на зямлі сваіх бацькоў, адданасць роднай сям'і і Бацькаўшчыне, сціпласць і актыўную творчую працу: «Ад каляровых сноў, ад халастога тлуму // паеду на Палессе, у лясы, // дзе – ні хвалы, ні зайздрасці, ні суму, // дзе брату брат я, а матулі – сын. // Пастаўлю хату цёплую ля гаю, // на беразе Гарыні ці Дняпра» [1, с. 9]. Паказальна, што паняцце радзімы ў М. Федзюковіча прыземлена-канкрэтнае, аднак народжана яно не адчувальна-асязальным вобразам, а ідзе з глыбінь душы. Больш традыцыйнае для беларускіх мастакоў слова адлюстраванне паняцця нацыянальнага ў абстрактна-сімвалічным, а часам і фальклорным ключы: у М. Багдановіча Радзіма – гэта валошка, у А. Вольнага – вішня, у У. Дубоўкі – шыпшына, у П. Броўкі – чарот, у Р. Баравіковай – рамонак, у Н. Мацяш – валошка і арабіны і г.д.

Заўважым, нацыянальна-патрыятычная тэма ў сучаснай беларускай літаратуры набыла падкрэслена драматычнае гучанне, пра што красамоўна могуць сведчыць такія вершы, як «Аддзяка» Р. Барадуліна, «Пасля рэферэндуму» В. Гардзея, «Ідзе ў кабінетах высокіх гульня...» Г. Бураўкіна і інш. Драматычна-трагедыйны тон характэрны і патрыятычным вершам М. Федзюковіча: «Мая Айчына, ты – душа маёй душы, // што абрастае сумам па табе, // пакуль я – за даламі, за лясамі... // О Бацькаўшчыны шчодрая зямля, // ты – сэрца майго сэрца, // што ўвабрала гром бубнаў усіх вяселляў на Палессі...» [1, с. 24–25]. Гэтыя паэтычныя радкі сведчаць, што эвалюцыя творчай індывідуальнасці мастака адбывалася паступова, спакваля, без паскораных жанрава-стылёвых мадыфікацый, эксперыментатарства зместу класічных free вершаваных форм. У выніку вытанчанасць

паэтычнай тэхнікі, фабульна разгорнуты асацыятыўны вобраз, яго «свежасць», «нечаканасць» асабліва ў ранніх творах паэта адцяняліся падкрэсленай пафаснасцю. Папярэднікамі ўжо не раз былі апаэтызаваны «блакітныя вочы Беларусі», «душа Радзімы».

Раннія вершы М. Федзюковіча даюць уяўленне пра яго непаўторны паэтычны ўніверсум, адметнасць яго вершаванай тэхнікі, спецыфіку яго светапогляда, якому ўласціва абвостранае адчуванне генетычнай сувязі з родным краем, мясцінамі сваіх блізкіх, адчуванне нацыянальнай прыналежнасці. Лірычны герой М. Федзюковіча валодае пачуццём прыгожага, здольны адчуць няўлоўныя нюансы вабнасці прыроднага наваколля, здольны захапляцца прыгажосцю і трывожыцца за лёс прыроды. Гэта духоўна багатая і шматгранная натура, якая абураецца грамадскай і паўсядзённай абыякавасцю, кан'юнктуршчынай, няшчырасцю, разам з тым асоба пяшчотная, далікатная, цнатлівая ў выражэнні інтымных пачуццяў, стрыманая ў выяўленні гранічнай роспачы.

Чарговы зборнік М. Федзюковіча «Мілавіца» (1971) засведчыў пашырэнне тэматычна-вобразнага і настраёвага дыяпазону паэтычнага ўніверсуму пісьменніка, з'яўленне устойлівых рыс паэтыкі, выпрацоўку цэласнай мастацкай сістэмы ў адзінстве стылёвых і філасофска-эстэтычных дамінант. Аўтара прываблівакоць гістарычныя постаці, славутыя асобы: Сцяпан Разін, Пугачоў, Ленін, Зорге, Віктар Поляк і інш. Пісьменнік востра рэагаваў на змены ў жыцці краіны, адгукаўся паэтычным словам на асваенне чалавецтвам космасу. Адзін з такіх твораў – верш «Мілавіца», які і даў назву паэтычнаму зборніку. У ім аўтар не толькі паэтызуе нябеснае, зорнае, касмічнае, але і выказвае замілаванасць зямным, мясцовым, родным: «Пакуль нам дораг водар глебы, // смак хлеба і паветра родны пах, – // ракетна-шматступенчатае неба // трымае нас трывала на плячах. // Цудоўна! Нам сягоння давялося // ў палёце на касмічным караблі // адчуць залежнасць асабістых лёсаў // ад лёсу нашай любае Зямлі» [3, с. 22].

Творчым поспехам паэта можна лічыць вершы, у якіх адчуваецца генетычная зрошчанасць свету лірычнага героя з вобразамі і малюнкамі сваёй этнапрасторы, калі ў цэнтры лірычнага перажывання стаяць не агульныя разважанні філасофскага плану, а канкрэтны свет лірычнага «я», штодзённыя клопаты, трывогі і перажыванні лірычнага героя. Да ліку такіх твораў належыць верш «Калісьці тут, на хутары, буяў гарод...», лірычны герой якога адчувае сябе няўтульна ў свеце, дзе знішчаецца прырода, адыходзіць у нябыт вясковы лад жыцця, страчваюцца духоўныя ідэалы продкаў, што вядзе да дысгарманічнага разрыву цялеснага з душой: «Каторы год не кланяецца мне // майго маленства сад асіроцелы; // нібы з душой разлучанае цела, – // ён угару сухое голле мкне.. // Я, мусіць, ад чужых турбот адвык – // вунь каня па-над выганам канае; // але мяне чамусьці не кранае // жалобнай кані неўтаймоўны крык. // Напэўна я пераступіў парог – // святы парог, акрэслены прыродай, // перад якой мой ваяўнічы продак // схіляў калені, шанаваў, бярог...» [3, с. 6].

М. Федзюковіч – майстар стварэння ёмістага, скандэнсаванага вобраза, адлюстравання гранёнай, адточанай паэтычнай думкі, умення заглыбіцца ў свае самыя запаветныя душэўныя хваляванні, аднак пры гэтым сфера асабістага, інтымнага ў яго не абмяжоўваецца вясковай ідыліяй, а выходзіць на гарызонты агульначалавечыя, у ёй асэнсавана агульнае, чужое як уласнае, дарагое сэрцу. Паэтычная думка пры гэтым натуральна цэласная, афарыстычная, філасофскі абагуленая: «Мяне паклікаў жураўліны вырай // у вёску, на радзіму... // Там – вясна! // Там навальніцай хмара прарасла, // каб красавалі нівы яравыя. // Ад бессані, // ад звону гарадскога // у край буслоў, калін і медуніц, // да яснавокіх, русых маладзіц // мяне вяртае самы юны спогад. // Жыццё пражыць – не поле перайсці? // Пражыць жыццё – // не разлучыцца з полем!» [3, с. 24].

У параўнанні з папярэднім зборнікам у кнізе «Мілавіца» М. Федзюковіч больш шырока, панарамна адлюстраваў матывы ўслаўлення прыроднай гармоніі, паэтызаваў канкрэтна-матэрыяльнае, звыкла-будзённае. Яго верш гучаў натуральна, арганічна, у ім

адчуваецца рытм свабоднага дыхання, рыфмічная гладкасць радка. Для паэта Драгічыншчыны не характэрны імпульсіўнасць, экзальтаванасць пачуцця, эмацыйны абрыў, інтанацыйны перапад, завастрэнне меладраматычных зрухаў. Федзюковіч імкнецца адшукаць гармонію ва ўсіх яе праявах. Лірычны герой зачароўваецца вабнасцю зімовага пейзажу, сузірае прыгажосць летніх малюнкаў прыроды. Лета ў паэтычным універсуме М. Федзюковіча азёрнае, навальнічнае, з громам, лужынамі, цяжкай гаспадарчай працай: «Бор з аблокамі загамоніць // і ўзляцяць ураганы-коні // з-пад грывастых, густых басоў. // Асядляныя навальніцы // бліскавіцамі празвіняць... // І, дальбог, што камусь прысніцца // ў гэту ноч зарапад сунічны, // жураўліная сенажаць» [3, с. 28].

Аднак лірычнага героя не пакідае адчуванне ўнутранага душэўнага цяпла, святла, уладкаванасці. Родныя вёска і краявіды ва ўяўленні паэта – гэта край «жураўлінага выраю», «жураўлінай сенажаці», «жураўлінай песні». Эпітэт «жураўліны» – своеасаблівая асацыяцыя з бестурботным, ціхамірным, размераным, нягучным жыццём. Адметную эмацыянальную настраёвасць пейзажнай лірыкі стварае арганічнае паяднанне ў паэтычным універсуме М. Федзюковіча двух, здавалася б, маласумяшчальных пачаткаў: гарманічнай сцішанасці і вонкавай дысгармоніі. Маруднасць, аднатоннасць, душэўны смутак саступаюць месца ў свеце складаных пачуццяў лірычнага суб’екта глыбіннаму адчуванню святла надзеі, што стварае своеасаблівую аўру інтымна-пяшчотных успамінаў: «Дзень лета – пераменліва-марудны, // надвор’е – наравісты конь-агонь: // як спыніцца – скрануць угору трудна, // як загрыміць з разгону – пад адхон! // І кружыць, кружыць, быццам авадзень, // стамляюча-бясконцы летні дзень... // Яснота ў садзе, светла на душы, // ва ўсім – спакой, развага, пастаянства. // І лета дні у гэткую хвіліну – // як мілыя, кароткія ўспаміны» [3, с. 29].

У паэтычным зборніку «Мілавіца» раскрыты цэлы спектр інтымных перажыванняў, сярод якіх дамінуюць пачуцці расстання, неўзаемнасці (вершы «Навошта сустракацца нам», «Так, да канца яшчэ далёка», «І год, і два не ведалі мы самі», «Каханне ці не каханне», «Каб быць шчаслівым, шчасце аддаю», «Чаму так атрымалася – няўцям», «Дзяўчыне летуценна-таямнічай», «Пераблытаны ўсе каляндарныя даты», «Імгненне» і інш.). Паэтызуючы незвычайнасць, узвышанасць, святасць кахання, М. Федзюковіча імкнецца адшукаць гармонію нават у кантрастных з’явах, адвечнай антыноміі, супрацьлегласцях быцця. Тым самым падкрэсліваецца думка аб духоўна-фізічнай шматграннасці жанчыны, немагчымасці пазнання яе зменлівай сутнасці: «А ты ўсё тая ж, // усё тая ж: // недасягальная, святая, – // мая і восень і вясна... // І плач і вокліч акрылёны, // і блаславенне і праклёны, // ва ўсім – нізрынуты кантраст» [3, с. 46–47].

Сардэчнае пачуццё ва ўяўленні лірычнай асобы М. Федзюковіча не абстрактна-ідылічнае пачуццё. Гэта свет надзвычай зямны, звыкла-знаёмы кожнаму. Каханне – гэта «шчырая размова, пакуль мы вачамі адзін аднаго вывучалі», «дотык пальцаў», «першы пацалунак», «няўтольная прага збліжэння» [3, с. 39]. Растанне, неўзаемнасць у каханні спараджаюць трывожна-балючыя эмоцыі, аднак лірычная асоба не шукае выйсця ў крыўдаванні, абвінавачванні Яе: «Разбрыліся па свеце і будні і святы... // І не знаю – на шчасце сваё ці бяду – // Я ўвесь час адмаўляю тваю вінаватасць, // Ты сцвярджаеш маю правату» [3, с. 45]. Такія скрушлівыя моманты жыцця герой М. Федзюковіча імкнецца перажыць стрымана і мудра, па-хрысціянску, і адпаведна спрадвечнай вясковай завядзёнцы, хоць адказаць на свае ўнутраныя пытанні яму ўдаецца не заўсёды («Чаму так атрымалася – няўцям: // былі мы разам, сёння кожны – сам» [3, с. 42]; «Хіба не праў філосаф? // Мне жыць у снах з табою давялося») [3, с. 35].

У лірычнага героя М. Федзюковіча адсутнічае юнацкая наіўнасць у складаных узаемастасунках з каханай, ён годна ўспрымае душэўныя ўзлёты і расчараванні, ствараючы ў сваім уяўленні ментальныя вобразы і мадэлі рэчаіснасці. Пры гэтым канцэпталогія яго шчасця канцэнтруецца вакол ідэй узаемнасці, гранічнай адданасці, шчымлівай

пяшчоты, незвычайнай душэўнасці як асновы паўнаты і гармоніі інтымнай сферы зямнога існавання: «Каб быць шчаслівым, шчасце аддаю – // табе!.. // Твая любоў – // на ўзроўні сэрца... // Тут – // бачу постаць стройную тваю, // там – // чую, голас твой ка мне нясецца. // Сумую, // радуюся, // гавару – // ва ўсім // тваё шукаю падабенства... // Лячу з гары – // здаецца, – // на гару, // ўгару іду – // лячу, // здаецца, – // ў бездань» [3, с. 40–41]. Цікавай уяўляецца архітэктоніка гэтага верша, у якім разарваная будова радка нагадвае то імітацыю пад пераход на «ўзровень сэрца», то ступеньчаты лёт з гары і новае ўзыходжанне па прыступках уверх, адлюстроўваючы асобнымі фрэймамі ўніверсальную цэласную канцэптасферу лірычнага героя як комплекс яго узаемазалежных, прыхаваных інтэнцый.

У «Мілавіцы», як і ў папярэдняй кнізе, адлюстравана стрыманасць у выяўленні гранічнай роспачнасці. Лірычны герой імкнецца да псіхалагічна-філасофскага самавыяўлення, асэнсоўвае плыннасць, незваротнасць часу, што ў выніку нараджае не элегічныя, а аптымістычна-мажорныя інтанацыі: «Цяпер напеў адзін злучае // і сум і радасць... Час бяжыць... // Так, час бяжыць... Бывай!.. Чакаю... // Чакаю – значыць буду жыць» [3, с. 34].

Матыў незваротнасці часу гучыць і ў вершы «Шыпшына». Лірычны герой абвострана адчувае ўласную пакорлівасць і экзістэнцыйную безабароннасць «пад адкрытым небам», перад «узбярэжжам усіх трывог» і няўмольным наступам часу. Нават згадкі пра мінулае не здольныя вярнуць ранейшых пачуццяў, стану ўзаемапаразумення між каханымі: «Нішто не вечна пад адкрытым небам. // Даруй мне, здагадацца я не змог, // чаму твая шыпшына гэтак нема // палала ў тую ноч перад зімой. // Уздрыгвала сузор’е спелай гронкай // над зарывам разбуджаных балот... // Усё-усё, апроч шыпшыны горкай, – // як сем гадоў назад – усё было...» [4, с. 37–38].

У 1979 г. выйшаў з друку апошні зборнік М. Федзюковіча «Макаў цвет», які акрэсліў чарговы этап эвалюцыі мастакоўскай індывідуальнасці, этап змены творчых арыенціраў, паглыблення лірызму, прыярытэта агульначалавечых каштоўнасцей, пашырэння спектра эмоцый і пачуццяў лірычнага «я». Паэтычная асоба М. Федзюковіча жыве «суровай памяццю» мінулай вайны, адчувае непарыўную сувязь з пакаленнем сваіх продкаў, асабістую адказнасць перад блізкімі ёй людзьмі і грамадствам у цэлым. «Маё сэрца – вышыня, заваяваная пахаванымі на вышыні сябрамі», – зазначае лірычны герой верша «Айчына», якім адкрываецца зборнік «Макаў цвет». Матыў драматычных успамінаў гучыць і ў вершы «Сумуе дзед», лірычны герой якога захапляецца стваральнай працай вяскоўцаў, маладым пакаленнем, здольным памножыць набыткі продкаў, годна прадоўжыць занятак земляробаў: «Сумуе дзед... // Пачуе голас трактара – // святлее, быццам вымыты расой... // Ён мо не раз планету па экватары // аперазаў сваёю баразной. // Глядзіць стары, як цеплынёй – бы рошчынай – // духмяна пахне, дыхае ралля... // Унук яго ў расхрыстанай сарочцы // прывычна цягне рукі да руля» [2, с. 12].

Лірычны герой Міколы Федзюковіча паўстае асобай духоўна багатай. Ён можа не толькі паэтызаваць будзёную працу селяніна, але і захапляцца багаццем і вабнасцю наваколля, тонка ўспрымаць няўлоўныя нюансы прыгажосці краявідаў роднай зямлі: «Вось і ворыва! // Луста за лустай – // пад нарогам паблісквае тлуста // наш палескі духмян чарназём. // Пчолы зводдаля кружацца роем, // пахне грушавым кветам, травою, // кучаравіцца пара-дымок» [2, с. 15]. Асаблівасцю мастацкай манеры Федзюковіча-пейзажыста з’яўляецца імкненне пералічыць, зафіксаваць нейкія дэталі, звычайна без канкрэтызацыі іх разгорнутымі метафарамі і параўнаннямі. Звяртаючыся да размоўных інтанацый, паэт падкрэслівае тое звычайнае і будзённае, што дорага сэрцу і што найчасцей застаецца па-за ўвагай з-за штодзённых гаспадарчых клопатаў: «На выгане, як бачыць вока, // снег адступае пакрысе, // і ўжо за бліжняй хатай вольха // цвіце ў засмужанай красе. // Гагочуць гусі на сугрэве, // сакокуць куры на двары... // Сусед у садзе

чысціць дрэвы – // бінтуе ранкі на кары. // Кот-ласунец прыжмурыў вейкі, // паважна ходзяць галубы, // і ў лужыне два верабейкі // свае ўскудлачылі чубы» [2, с. 20–21].

У межах вясковай тэмы М. Федзюковіч выяўляў ідэі захавання радзінных і нацыянальных каранёў, супярэчнасці паміж горадам і вёскай, каштоўнасці працы чалавека, удзячнасці роднаму дому і малой радзіме. На дадзеным этапе творчасці паэт аддаваў перавагу медытатыўнай лірыцы, наследуючы лепшыя традыцыі медытатыўна-аналітычнай плыні беларускай паэзіі (М. Танк, А. Куляшоў, К. Кірэенка, С. Дзяргай, С. Гаўрусёў, А. Сербантовіч і інш.).

Адметнасць паэтычнага універсуму М. Федзюковіча выявілася ва ўменні цэласна і сінкрэтычна глядзець на дробнае, індывідуальнае, побытавае і здольнасці бачыць у гэтым агульначалавечае, існці ад рэгіянальнага да касмічнага (В. Карамазаў, Р. Барадулін, В. Зуёнак, Я. Янішчыц, В. Гардзей, В. Жуковіч). У многіх вершах паэт згадвае канкрэтных людзей, аднавяскоўцаў, знаёмых і блізкіх, назвы рэк (Прыпяць, Ясельда, Сож) і населеных пунктаў Берасцейшчыны (Брэст, Лунінец, Сітніца, Гутава), захапляецца прыродай роднага рэгіёна. Лірычны герой М. Федзюковіча выразна адчувае сваю рэгіянальна-спадчынную прыналежнасць, ганарыцца крэўнай лучнасцю з палескай зямлёй: «Палессе, родны край, // я рад, што ёсць // куды свой позірк // скіраваць мне // зноўку, // што я табе – // не пасынак, // не госць» [3, с. 77]. Адным з лепшых «рэгіянальных» твораў паэта з'яўляецца верш «Вёска Гутава»: «Вёску Гутава ў снег захуталі // давідна свежакі вятры. // Сустракае нас вёска Гутава // крыкам пеўняў, сталёвым грукатам... // Вёска Гутава – тры вярсты! // А ўгары, цішынёй ахутаны, // цьмяны месяц ледзь-ледзь ліпіць... // Блаславёная вёска Гутава, // мне з табою спяваць, і гутарыць, // і заўсёды цябе любіць» [2, с. 13–14].

Асобныя грані паэтычнага універсуму М. Федзюковіча абумоўлены канкрэтным жыццёвым і гістарычным фактарам. Глыбока і натуральна ў творчасць паэта ўвашлі тэмы роднай вёскі, сваяцтва, міжчалавечых стасункаў. Эвалюцыя мастацкага свету пісьменніка адбывалася ў рэчышчы паглыблення лірызму, спавядальнасці, пераходу лірычнага «я-мінулага» ў «я-цяперашняе», пашырэння тэматычна-вобразнага і настраёвага дыяпазону паэтычнага універсуму пісьменніка. У паэта паступова выцяснялася экзістэнцыйна-трагедыйная парадыгма сентыментальна-рамантычным элементам (падаўленне грамадзянскіх матываў і пашырэнне лірызму, аўтабіяграфізму, рэгіянальнага пачатку). Пісьменнік валодаў майстэрствам ствараць ёмісты, скандэнсаваны вобраз, дакладна і выразна выяўляць думку, шчыра і годна адлюстроўваць інтымную сферу, заглыбляцца ў самыя запаветныя перажыванні, удала спалучаючы пры гэтым лірызм і філасафічнасць, рэгіянальнае і агульначалавечае.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Федзюковіч, М. Зямля-магніт : вершы / М. Федзюковіч. – Мінск : Беларусь, 1968. – 62 с.
2. Федзюковіч, М. Макаў цвет : лірыка / М. Федзюковіч. – Мінск : Маст. літ., 1979. – 68 с.
3. Федзюковіч, М. Мілавіца : лірыка / М. Федзюковіч. – Мінск : Беларусь, 1971. – 86 с.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 02.06.2016

***Smal V.M.*** **The Evolution M. Fedyukovich's Creative Individuality in the Context of National Easthetic Traditions**

*The article deals with the peculiavity of M. Fedyukovich's poetry. It analyzes the evolution of his creative individuality. The emphasis is put on syncrethy of literary influences and heritage at different stages of the writer's work; on the substitution of existensional-tragic paradigm by romantic elements (instead of social tunes lyric is presented alongside with his biography and regional elements).*